[1] Miesiecznik Połocki. № 1. 1818. S. 2.
[2] Гл.: Wielka Encyklopedia Powszehna Ilustrowana. Warszawa, 1890. T. 1. S. 367.
[3] Gwiazda Zaranna. 1911. № 1—2. S. 1.
[4] Гаворачы аб прычынах такой сітуацыі, Дворжачак меў на ўвазе не толькі адсутнасць матэрыяльных сродкаў для ўтрымання пастаяннага выдання, але і невысокую ступень грамадскай актыўнасці палякаў.
[5] Гл.: Nad Swisłocza. 1912. Czerwiec. S. 4.
[6] Гл.: Pogon. 1915. № 1. 7/20.03. S. 4.
[7] Гл.: Dziennik Minski. 1917. 1/14. 07.
[8] Гл.: Там жа. 07/20.08.

А. У. МАСЬКОВА

# ЖАНР ЭСЭ Ў СВЯТЛЕ ТЭОРЫІ

У сучаснай беларускай і рускай мовах слова «эсэ» («эссе») з'яўляецца калькай з французскага «essai» («дослед»), узыходзячага, у сваю чаргу, да лацінскага «exaqium», што азначае «ўзважванне». У XVIII—XIX стст. у Расіі быў прыняты пераклад «дослед», «эсэй». І «нешта» («Нешта аб...») ад англійскага «essay».

На Захадзе тэрмінам «эсэ» характарызуюць самыя розныя творы —ад дарожных нататкаў да літаратурна-крытычных трактатаў. Гэта шырокае выкарыстанне тэрміна склалася гістарычна: у заходнееўрапейскай літаратуры не было, па сутнасці, паняцця «публіцыстыка», яго замяняла «эсэістыка».

У нашым разуменні эсэ часта атаясамліваецца з нарысам, чаму таксама ёсць гістарычныя прычыны. Але эсэ не адпавядае шмат у чым нарысавай мадэлі, таму лагічна будзе разглядаць яго як самастойны жанр мастацкай публіцыстыкі. У такім выпадку эсэ павінна мець канкрэтнае вызначэнне, падобна любому іншаму самастойнаму жанру.

Жанр эсэ стаіць вельмі блізка да асобы. Паняцце «асоба» прадугледжвае наяўнасць у індывіда пэўнага ўзроўню свядомасці і самасвядомасці. Эсэ склалася як форма, цалкам адпавядаючая такому разуменню і самаўсведамленню асобы. Асабістасць, суб'ектыўнасць, інтымнасць, свабода самавыяўлення з'яўляюцца самымі істотнымі для жанру эсэ рысамі, і хаця яны належаць не толькі эсэ, іх унутраная сувязь —абавязковая прымета жанру. Гэта не сума якасцей, што запазычаны ў іншых жанраў, а стрыжнёвыя элементы сістэмы. Іх канцэнтрацыя і арганізацыя адрозніваюць эсэ ад іншых жанраў, у тым ліку і ад нарыса.

З дапамогай эсэ асоба публіцыста далучаецца да натуральнага для яе як грамадскага, культурнага, эрудзіраванага, творчага чалавека спосабу ўпарадкавання жыццёвых уражанняў, спосабу зразумення жыццёвых з'яў, як знешніх, так і ўнутраных, г. зн. авалоданню ўласным вопытам, уключаючы ўнутраны вопыт, і суб'ектыўнае прачытанне і адлюстраванне вопыту іншых людзей і навакольнай рэчаіснасці наогул.

Нарэшце, эсэіст нярэдка піша без акрэслена сфармуляванай тэмы і пэўнага сюжэта. Дакладней, сюжэтам становіцца яго ўласнае «Я», тое пачуццё, якое валодае ім і вызначае яго адносіны да навакольнага свету. Эсэісцкая манера пісьма ўключае цэлы дыяпазон душэўных хваляванняў, нечаканых думак, якія пераплятаюцца і нават супярэчаць адно другому, ствараючы мноства адценняў значэнняў. Складана, напрыклад, успомніць якi-небудзь канкрэтны ход думкі Мантэня ў яго «Essais». Засталося толькі мноства асацыяцый і нечаканых адкрыццяў.

Эсэісцкі стыль пісьма, па сутнасці, вельмі натуральны. Нават калі мы проста чытаем кнігу, то бачым скрозь яе ўласнае жыццё. У працэсе чытання мы вольна ці нявольна супастаўляем сэнс кніжнай старонкі з тым, што ў нас на душы. Праз такое супастаўленне нярэдка і адкрываецца ўласнае «Я». Пры пісьме адбываецца адваротны працэс, зноў жа зусім натуральны.

Шырокія магчымасці эсэіста ў свабодным выяўленні сваіх поглядаў, эмоцый, сімпатый і антыпатый даюць падставу некаторым даследчыкам называць эсэ «свабодным» жанрам. Але ж эсэ, безумоўна, не можа быць свабодным ад найбольш значных патрабаванняў, якія прад'яўляюцца да твора любога жанру. Яго свобода — гэта непрыманне аўтарам выпрабаваных і надзейных метадаў і імкненне знайсці сваю дарогу да чытача, імкненне да выбранасці, элітарнасці.

Прызнаная элітарнасць эсэ — вынік рэдкага дару эсэіста. Гэта жанр дасціпных, эрудзіраваных, бліскучых літаратараў, якія дзеляцца сваім інтэлектуальным багаццем, назіральнасцю, учэпістай памяццю, вялікім жыццёвым вопытам. Прынята гаварыць нават пра «кабінетнасць» таленту эсэіста. Успомнім, што «Разважанні» Марка Аўрэлія — аднаго з першых у гісторыі эсэістаў — не што іншае, як «кабінетная» апрацоўка вядомых філасофскіх тэорый.

Свабодны, не абмежаваны строгімі рэгламентацыямі і стыль эсэ. Самыя разнастайныя пласты лексікі — ад зніжана-размоўнай да паэтычнай — спалучаюцца ў эсэ з гібкімі сінтаксічнымі канструкцыямі. Асноўныя характарыстыкі эсэісцкага стылю — экспрэсіўнасць і вобразнасць, значнае праяўленне настрою, думак і пачуццяў. Свабодную эсэісцкую манеру пісьма нельга аддзяліць ад адточанасці, «элегантнасці», дасканаласці стылю. Гэта, нараўне з незалежнасцю думкі, агульнапрынятая аснова эсэ. Калі падабраны слушныя словы і ўстаноўлена дакладная інтанацыя, стыль становіцца другім «Я» пішучага.

Так нараджаецца *эсэ* — мастацка-публіцыстычны жанр, у якім глыбокая задума арганічна спалучаецца са свабоднай, натуральнай манерай выкладання, і якому ўласцівы аўтарская адкрытасць і суб'ектыўнасць, экспрэсіўнасць і вобразнасць, папярэднасць і эмпірычнасць, лаканічнасць і вытанчанасць стылю.

Менавіта наш складаны час асабліва вылучыў жанр эсэ, зрабіў яго папулярным. У апошнія гады на фоне светапогляднага крызісу ў краіне адбываецца актывізацыя грамадскай свядомасці, развіццё самасвядомасці асобы, публіцыста перш за ўсё. Як справядліва заўважыў В. Г. Бялінскі, «калі ёсць ідэі часу, то ёсць і формы часу».

К. П. ЮРОЙЦЬ

## СУЧАСНЫ ЗМЕСТ ГАЗЕТНАЙ РУБРЫКІ «НА ТЭМЫ МАРАЛІ»

З усёй сукупнасці праблем грамадзянскага жыцця, якія асвятляюцца ў друку, маральная праблематыка найменш даследаваная. Зразумець прыроду сённяшніх перамен у жыцці нашага грамадства, прааналізаваць сацыяльны змест маральных паводзін людзей у новых умовах, убачыць іх у штодзённых буднях, у працоўных здзяйсненнях і побыце, дакладна намаляваць вобраз сапраўднага героя нашых дзён — адзін з актуальных напрамкаў беларускага друку.

Удалае адлюстраванне жыцця ў яго тыповых праявах — творчая ўдача журналіста. І наадварот, няўвага да прыярытэтных жыццёвых арыенціраў, павярхоўны погляд на справы і ўнутраны свет сучасніка спараджае дробнатэм'е, недакладнасць аўтарскай пазіцыі. Цесная сувязь паміж прафесійным майстэрствам і чуйнасцю да ідэй нашага часу надаюць журналісцкай працы сэнс і грамадскую значнасць.

Галоўны аб'ект даследавання журналіста-аналітыка, публіцыста— чалавек. Аналіз свету чалавечай асобы павінен адбывацца не на павярхоўным праўдападабенстве, не на бесстароннім рэгістраванні фактаў, а на раскрыцці сутнасці працэсаў руху жыцця, падзей і з'яў сённяшняга дня.

Ні дабрабыт, ні адукаванасць, ні выхаванне не ідуць у абавязковым парадку побач з высокай чалавечай духоўнасцю. Пакуль чалавек не сутыкнуўся з другім чалавекам, пакуль не прайшоў праз школу працоўнага выхавання, ні праз якую яго сталую мараль наогул нельга гаварыць. Толькі ў калектыве, ва ўзаемаадносінах з іншымі людзьмі чалавек выяўляе сябе.

Сёння ў падыходзе рэдакцый да асвятлення ролі калектываў у фарміраванні маралі, пры яўнай тэматычнай пераравістасці, праглядваецца імкненне паказаць сітуацыі ў непарыўнай сувязі ўсіх сфер грамадскага жыцця — эканамічных, сацыяльна-палітычных, духоўных. Аб'ектам журналісцкага аналізу становяцца маральныя адносіны, якія раскрываюцца ў сацыяльнай практыцы праз паводзіны людзей, іх учынкі. Таму аб'ектам этычнага даследавання журналістыкі павінны быць рэальныя, вынікаючыя з наяўных умоў існавання людзей практычныя